П 1164

Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ГАЛОЎНАЕ КІРАЎНІЦТВА
АДЗІНАЙ ГІДРА-МЕТЭАРАЛАГІЧНАЙ СЛУЖБЫ
пры НКЗ БССР

ДЭКАДНЫ БЮЛЕТЭНЬ ГАЛОЎНАГА КІРАЎНІЦТВА І ГІДРАМЕТІНСТЫТУТА

Адрас рэдакцыі: Менск, Шырокая 28. Галоўнае Кіраўніцтва АГМС БССР.
Тэл. 24271 і 23280.

№ 20 (133) | 21—31 снежня | 1933 г.

ЗМЕСТ

СІНАПТЫЧНЫ АГЛЯД.

У першыя тры дні дэкады на тэрыторыі Беларусі назіралася пахмурнае халоднае надвор'е, выклікаемае моцным патокам халодных мас арктычнага паветра, з якіх складалася вобласць павышанага ціску ў выглядзе грэбеня антыцыклона. У гэтыя дні т-ра паветра на тэрыторыі БССР даходзіла да —23—25 градусаў.

Змяшчаючыся ў паўднёвым напрамку, масы арктычнага паветра, з якіх складаўся грэбень антыцыклона, ператвараюцца ў масы кантынентальнага палярнага паветра і адыходзяць на Украіну. Тым часам з Скандынавіі ў паўднёва-ўсходнім напрамку рухаецца цыклон, які складаецца з мас цёплага марскога палярнага паветра. 24 снежня праз тэрыторыю Беларусі праходзіць лажбіна гэтага цыклона, а 25 і 26 снежня, хутка змяшчаючыся на паўднёвы ўсход, рухаецца цэнтральная частка цыклона. У гэтыя дні праз Беларусь праходзіць шэраг павет-

Інв. 1988 - БЛ 861
Бібліятэка імені Леніна

Табліца вынікаў метэаралагічных

№№ па карце	Назва станцый	Тэмпература паветра															
		21	22	23	24	25	26	27	28	29	30	31	Сярэдняя	Нармальн.	Максімальная	Мінімальная	Чысло, калі наглядаўся мінімум
2	Дрыса [1]	—13	—19	—11	0	—2	—13	—12	—13	—11	—10	—6	—10	—	1	—24	23
3	Полацак [2]	—11	—18	—13	—2	—2	—14	—12	—14	—12	—11	—6	—11	—6	—1	—25	23
—	Вялікія-Лукі [15]	—14	—20	—13	—1	—4	—14	—12	—14	—14	—13	—7	—11	—	1	—23	22
68	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
84	Сураж	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
7	Нова-Карлёва [3]	—16	—18	—17	—4	—3	—12	—13	—17	—15	—13	—8	—12	—7	—1	—23	23
8	Лепель [4]	—14	—17	—15	—2	—2	—12	—12	—14	—12	—10	—6	—10	—	1	—23	23
75	Плешчаніцы [5]	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
70	Бобр [6]	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
13	Барысаў [7]	—13	—16	—16	—3	—1	—9	—11	—13	—12	—10	—6	—10	—6	0	—23	23
16	Менск [8]	—13	—15	—14	—3	—1	—9	—11	—12	—11	—10	—5	—9	—5	1	—23	23
93	Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
23	Мар'іна-Горка [9]	—14	—14	—17	—4	—1	—7	—11	—12	—10	—12	?	—10	—5	0	—23	23
25	Асіпавічы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
10	Орша [10]	—12	—16	—16	—4	—2	—10	—13	—16	—14	—11	—7	—11	—7	0	—23	23
19	Горкі [11]	—15	—16	—18	—5	—3	—9	—15	—17	—14	—12	—8	—12	—7	0	—24	23
89	Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
28	Слуцак [12]	—13	—13	—15	—4	0	—6	—10	—11	—10	—9	—4	—9	—	0	—21	23
30	Мар.-Сосны	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
21	Магілеў [13]	—14	—15	—17	—5	—2	—9	—13	—16	—14	—11	—7	—11	—6	0	—23	23
73	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
27	Чэрыкаў [14]	—13	—13	—16	—7	—2	—9	—19	—17	—14	—11	—8	—12	—6	2	—23	28
191	Касцюковічы [15]	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
31	Турск [16]	—13	—13	—16	—5	—1	—6	—13	—14	—12	—11	—7	—10	—6	0	—18	29
32	Жлобін [17]	—11	—13	—16	—6	—1	—6	—13	—13	—12	—10	—7	—11	—6	0	—18	23
33	Жыткавічы [18]	—10	—13	—15	—4	1	—4	—9	—9	—11	—8	—3	—8	—5	2	—16	23
37	Калінкавічы [19]	—10	—13	—16	—6	—0	—4	—11	—10	—12	—9	?	—9	—5	1	—19	24
39	Лельчыцы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
85	Чачэрск [20]	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
83	Барба	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
38	Гомель [21]	—10	—13	—16	—8	—2	—5	—17	—14	—13	—11	—8	—11	—6	0	—19	27
35	Васілевічы [22]	—10	—13	—16	—7	—1	—5	—13	—11	—11	—9	—7	—9	—5	1	—19	23
40	Людвінава [23]	—9	—13	—14	—8	0	—3	—13	—11	—12	—8	—8	—10	—5	0	—19	29

[1]) мяцель (21, 29); [2]) туман (24, 25), мяцель (29, 30); [3]) мяцель (28, 29); [4]) мяцель (29), туман (30); лёд (30), [9]) мяцель (24); [10]) мяцель (24); [11]) мяцель (21), галалёд (24); [12]) туман, галалёд (24); галалёд (24); [19]) мяцель (21, 22); [20]) мяцель (29); [21]) мяцель (21, 22); [22]) галалёд (30); [23]) мя-

назіранняў за 21—31 снежня 1933 г.

Адносная вільготн. паветра за 13 г. у %	Тэмпература паверхні глебы: Максімал.	Мінімальн.	Чысло, калі нагляд. мінімум	Ападкі ў мм: 21	22	23	24	25	26	27	28	29	30	31	Сума	Снегавы насц…: Вышыня ў см	Шчыльнасць	Характарыстыка снегавога сцілу
74	—	—	—	0.1	..	1.0	1.0	0.4	0.3	0.2	0.2	0.2	5.0	2.0	10.4	13	0.24	роўнамер
80	—	—	—	..	..	1.0	2.0	0.6	0.6	0.2	0.2	..	4.0	1.0	9.6	19	0.25	скар. на па
82	0	—26	22	0.1	..	0.6	1.0	2.0	0.2	1.0	0.3	..	3.0	4.0	12.2	22	0.22	роўнамер
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
86	—1	—26	23	..	..	1.0	0 5	7.0	0.1	..	..	..	1.0	4 0	13.6	25	0.25	роўнамер
88	—	—	—	..	0.1	0.5	2 0	0 5	0.6	0.6	0.2	0.2	0.5	3 0	8 2	12	0.29	скар. на па
—	—	—	—	0.1	..	1.0	0.3	1 0	0.1	0.1	0.1	0.3	0 2	1.0	4.2	10	0.10	роўнамер
—	—	—	—	0.1	0.1	0 2	1 0	0.3	0 5	0.2	0.2	0.1	0 3	1.0	4.0	10	0.27	роўнамер
89	—	—	—	0 2	0.1	0 2	0 6	1.0	0 1	0 5	0 7	1 0	3 0	0.5	7.9	12	0.19	скар. на па
85	2	—20	23	0.1	0.1	0.2	1.0	2.0	0 3	0.1	0.1	3.0	1.0	0.4	8.3	16	0.15	роўнамер
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
85	—	—22	23	0 1	0.2	0.3	0.1	1.0	0.2	0.3	0.1	0.6	1 0	0.1	4.0	14	—	скар. на па
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
83	—	—26	22	1.0	0.4	0.4	1.0	0 5	1.0	0 2	0.5	0.5	1.0	7 0	13.5	13	0 16	роўнамер
85	—1	—26	23	0.3	..	0.3	1.0	2.0	0 1	0.1	0.1	..	2.0	9.0	14.9	14	0.22	роўнамер
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
88	—	—20	23	0.1	0.1	0.2	0.1	2 0	..	0 1	..	0.4	1.0	1.0	5.0	8	—	сумёты
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
87	—	—	—	0.3	0.4	0.5	1.0	1.0	0 2	0.1	1.0	2.0	2.0	8.0	16.5	8	—	роўнаме
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
86	—	—	—	1.0	0.5	0 5	1.0	1.0	..	..	0.4	0 2	2 0	8 0	14.6	5	—	роўнаме
—	—	—	—	2.0	0.5	1.0	1.0	1.0	0.1	..	0.1	0.6	0.3	1.0	7.6	11	—	роўнаме
85	—	—	—	..	0.1	..	0.5	..	..	0.3	0.1	1.0	1.0	9 0	12 0	15	0.15	няроўнам
—	—	—	—	1.0	0.6	0.1	1.0	1.0	..	0 6	0.1	0.6	3.0	..	8.0	13	0.15	скар. на п
85	—	—	—	0.1	0.1	0.1	1.0	2.0	0.1	0.1	..	1.0	1.0	0.6	6.1	14	0.20	скар. на п
92	—	—	—	0.5	0.3	0.1	0.3	1.0	..	0.2	1.0	0.6	0.1	8 0	12.1	15	0.16	"
—	—	—	—	2.0	0.3	0.1	0.1	2.0	4.0	0.1	1.0	0.1	3 0	1.0	13.7	16	—	"
—	—	—	—	3.0	1.0	0.4	1.0	1.0	..	..	0.5	2.0	3.0	5.0	16 9	—	—	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	5.0	1 0	0.2	1.0	1.0	0.9	0.1	0 3	0.3	0.3	..	10.1	16	0.23	сумёт
81	—	—18	23	0.6	1.0	0.1	0.4	0.3	0.1	0.2	0.2	2.0	2.0	—	—	13	0.25	скар. на п
92	1	—19	29	1.0	1.0	..	0.5	3.0	0.1	2.0	0.2	2 0	1.0	0.1	10.9	16	—	сумёт

[5]) туман (23, 19, 24); [6]) туман (22), мяцель (29); [7]) мяцель, галалёд (30, 31); [8]) мяцель
[13]) мяцель (21); [14]) мяцель (30); [15]) мяцель (24, 25); [16]) мяцель (21, 22); [17]) мяцель (27), галалёд
цель (21), туман (24).

Табліца вынікаў метэаралаг. назіранняў за 21—31 снежня 1933 г.

Кліматычны раён	№№ па карце	Назва станцый	Вецер: Пераважаючы: Напрамак	Вецер: Пераважаючы: Хуткасць	Вецер: З максім. хуткасцю: Напрамак	Вецер: З максім. хуткасцю: Хуткасць	Інсаляцыя ў %%	Сярэдняя воблачнасць у 10-балавай сістэме: Агульная	Сярэдняя воблачнасць у 10-балавай сістэме: Ніжняя	Сярэдні стан паверховага пласта глебы (на глыб. 10—15 см)
I. Паўночны (Вазёрны)	2	Дрыса.	E	6	E	18	—	10	8	замерзшая
	3	Полацак	NW	4	E	10	—	9	8	"
	—	Вялікія Лукі . . .	N	6	SE	14	—	8	8	"
	68	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—
	84	Сураж.	—	—	—	—	—	—	—	—
	7	Нова-Каралёва . .	E	7	E	18	6	10	8	замерзшая
II. Пераходны (Вадападзельны)	8	Лепель	N	4	N	12	—	8	6	замерзшая
	75	Плешчаніцы . . .	—	—	—	—	—	—	—	"
	70	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	"
	13	Барысаў	SE	4	SE	12	.	8	8	замерзшая
	16	Менск	SE	4	SE	7	—	9	9	"
	93	Бярэзіна	—	—	—	—	.	—	—	—
	23	Мар'іна-Горка . . .	SE	4	N	10	—	8	8	замерзшая
	25	Асіпавічы	—	—	—	—		—	—	—
	10	Орша	SE	4	NE	7	—	10	8	замершая
	19	Горкі	SE	6	SE	12	—	10	8	"
III. Цэнтральны (Раўнінны)	89	Клічаў.	—	—	—	—	—	—	—	—
	28	Слуцак	SE	6	N	15	—	8	8	замерзшая
	30	Мар'іна-Сосны. . .	—	—	—	—	—	—	—	—
	21	Магілеў	N	4	SE	12	—	10	8	замерзшая
	73	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў	N	4	NW	10	—	8	8	замерзшая
	191	Касцюковічы . . .	—	—	—	—	—	—	—	"
	31	Турск	E	4	SE	10	—	10	10	"
	32	Жлобін	S	6	N	12	—	10	10	"
IV. Паўднёвы (Нізінны)	33	Жыткавічы	E	4	N	15	—	10	10	замерзшая
	37	Калінкавічы. . . .	E	4	E	15	—	10	10	"
	39	Лельчыцы	—	—	—	—	—	—	—	—
	85	Чачэрск	—	—	—	—	—	—	—	замершая
	83	Барба.	—	—	—	—	—	—	—	—
	38	Гомель	N	4	SE	10	—	9	6	замерзшая
	35	Васілевічы	NW	4	SE	12	0	10	9	"
	40	Людвінава	W	—	SE	10	—	10	10	"

раных падзелаў—аклюзій, якія падзялялі масы цёплага морскага палярнага паветра ад больш халодных мас кантынентальнага палярнага паветра. дзякуючы чаму ў гэтыя дні наглядалася павышэнне т-ры, павелічэнне воблачнасці і выпадзенне снегу.

27 і 28 снежня на тэрыторыі БССР захоўваецца пахмурнае надвор'е, але наглядаецца нязначнае паніжэнне т-ры дзякуючы таму, што масы марскога палярнага паветра, рухаючыся на паўднёвы ўсход, уступілі сваё месца больш халодным масам кантынентальнага палярнага паветра, якія складалі вобласць павышанага ціску—антыцыклон. У гэтыя дні на тэрыторыі Беларусі наглядаецца невялікае выпадзенне снегу.

29, 30 і 31 снежня з паўночнага ўсхода на паўднёвы захад змяшчаюцца халодныя масы кантынентальнага палярнага паветра, што выклікала невялікае паніжэнне т-ры. 31 снежня масы кантынентальнага арктычнага паветра ператвараюцца ў масы кантынентальнага палярнага паветра, у якіх Беларусь і знаходзіцца да першых дзён студзеня 1934 года.

Наогул гэта дэкада характэрна халодным, пахмурным і ветраным надвор'ем з невялікім выпадзеннем снегу і нязначнымі зменамі барычных вобласцяў.

Я. Івашчанка.

Метэаралагічная характарыстыка за 21—31 снежня 1933 г.

Амаль на працягу ўсёй дэкады трымалася вельмі нізкая тэмпература. Асабліва нізкай яна была ў паўночнай палове БССР 22-га чысла, а ў паўднёвай 23-га да —19 і —16°. 24-га і асабліва 25-га т-ра значна павысілася—блізка да 0°, а мясцамі нават вышэй нуля. 26-га наглядалася адразу рэзкае паніжэнне т-ры, у паўночна-ўсходняй палове БССР да —9—14° і ў паўднёва-заходняй да —4—6°. Паніжэнне т-ры працягваецца да 28-га, прычым асабліва значным з'яўляецца на ўсходзе, да —17°. У апошнія дні дэкады т-ра некалькі павысілася.

Сярэдняя дэкадная т-ра хісталася ад —8 да —12°, нармальная т-ра для гэтай дэкады роўна —5—7°, з гэтага відаць, што надвор'е было надзвычайна халодным. Максімальная т-ра хісталася каля 0°, мінімальная т-ра па ўсёй БССР каля —23°, толькі ў паўднёвай зоне —19°.

Ападкаў за дэкаду выпала ў сярэднім ад 5 да 15 мм. Па тэрыторыі яны размеркаваліся наступным чынам: каля 15 мм выпала каля ўсходняй мяжы БССР, у Оршы, Магілеве, Чэрыкаве, а таксама на поўдні рэспублікі. На астатняй тэрыторыі выпалі малыя колькасці, каля 5—10 мм. На працягу дэкады ападкі размеркаваліся такім чынам, што амаль кожны дзень выпадала хоць невялікая іх колькасць, самыя-ж значныя ападкі выпалі 31-га.

Вышыня снегавога насціла ў большасці месц хістаецца каля 10—15 см, толькі ў Новым-Каралёве роўна 25 см.

Вятры пераважалі паўночна-ўсходнія з значнымі хуткасцямі, якія мясцамі дасягалі 15—18 м/сек.

Воблачнасць складала 90—100% агульнага пакрыцця неба. Сонечнае ззянне амаль зусім не наглядалася.

Н. Малішэўская.

Табліца вынікаў метэаралагічных наз

Кліматычны раён	№№ на карце	Назва станцый	Тэмпература паветра: Сярэдняя	Адхіленне ад нормы	Максімал.	Дата	Мінімальная	Дата	Адносная вільг. у %%: Сярэдняя	Мінімальная	Тэмпература на паверхні глебы: Мінімальная	Дата	Лік дзён з тэмператур. глебы ≤0°	Ап(а)...: Сума	Норма	Л... ≥ 0.1 мм
I. Паўночны (вазёрны)	2	Дрыса	—2.6	—	8.0	1	—21.5	29	90	60	—	—	—	55	—	20
	3	Полацак	—2.2	—1.6	8.3	1	—18.3	29	90	60	—	—	—	71	37	17
	68	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	64	—	17
	84	Сураж	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	7	Нова-Каралёва	-2.8	—1.4	7.5	2	—20.6	29	90	65	—22.4	29	28	64	45	10
II. Пераходны (вадападзельны)	8	Лепель	1.4	—	7.4	1	—14.4	29	—	—	—	—	—	60	49	21
	75	Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	61	—	21
	70	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	73	—	18
	13	Барысаў	—0.9	—0.6	8.0	1.2	—13.4	29	90	40	—	—	—	75	42	14
	16	Менск	—0.9	—0.8	8.7	1	—13.5	29	—	—	—13.5	29	29	57	50	21
	93	Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	42	—	—
	23	Мар'іна-Горка	—0.2	—0.1	7.9	4	—12.5	29	—	—	—10.7	30	20	56	43	20
	25	Асіпавічы	0.0	+0.3	—	—	—	—	90	55	—	—	—	49	—	11
	10	Орша	—1.4	—0.5	11.0	2	—16.6	29	90	50	—15.5	29	28	67	50	17
	19	Горкі	—1.5	—0.5	10.6	2	—17.8	29	90	50	—15.0	29	23	50	48	15
III. Цэнтральны (раўніны)	89	Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	46	—	20
	28	Слуцак	0.3	—	8.1	1	—11.2	29	90	50	—10.9	29	23	47	—	15
	30	Мар.-Сосны	0.2	—0.4	8.4	3	—11.5	30	85	45	—14.0	30	26	69	—	16
	21	Магілеў	—0.7	0.0	11.2	2	—15.1	29	90	40	—	—	—	57	46	11
	73	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў	—0.5	+0.3	11.4	1	—15.0	29	90	45	—	—	—	63	4[illegible]	14
	191	Касцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	52	—	13
	31	Турск	0.1	+0.4	11.7	1	—13.1	29	—	—	—12.8	29	25	50	—	14
	32	Жлобін	0.4	+0.6	10.8	1	—12.1	29	85	—	—	—	—	67	—	16
IV. Паўднёвы (нізіны)	33	Жыткавічы	0.7	+0.6	8.8	3	—11.8	30	85	40	—	—	—	40	—	16
	37	Калінкавічы	0.9	+0.5	10.9	2	—11.4	29	90	45	—	—	—	30	38	11
	39	Лельчыцы	1.2	—	9.6	2	—10.9	30	85	50	—	—	—	39	—	14
	85	Чачэрск	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	51	—	12
	83	Барба	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	38	Гомель	0.7	+0.5	12.2	1	—12.5	29	85	—	—	—	—	46	—	14
	35	Васілевічы	0.8	+0.6	12.1	1	—11.8	29	85	40	—10.4	30	22	41	4[illegible]	16
	40	Людвінава	1.5	+0.9	12.7	1	—11.1	29	85	40	—10.8	30	18	52	—	20

ых назіранняў за лістапад 1933 г.

Норма	Ападкі ў мм: Лік дзён з ападкамі ≥ 0.1 мм	≥ 0.5 мм	≥ 1.0 мм	≥ 2.0 мм	≥ 5.0 мм	≥ 10.0 мм	≥ 20.0 мм	Вецер: Пераважаючы напрамак	Вецер: Сярэдняя хуткасць	Воблачн. у 10-балавай сістэме: Агульная	Воблачн.: Ніжняя	Інсаляцыя ў %% магчымай	Лік дзён: Ясных	Пахмурных	З туманам	За снегавым насцілам	Увага
—	20	15	12	7	4	1	0	SW	3.2	8.2	7.6	—	2	18	8	—	
37	17	13	12	9	5	3	0	SW	2.8	7.7	7.6	—	2	20	12	18	
	17	11	8	8	5	2	0	—	—	—	—	—	—	—	11	—	
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	
45	10	8	8	7	3	3	0	S i W	3.5	7.6	7.2	16	2	19	11	16?	
49	21	13	9	8	5	0	0	SW	3.4	7.5	6.9	—	3	17	11	—	
—	21	13	9	7	5	2	0	—	—	—	—	—	—	—	12	—	
—	18	14	10	8	5	3	0	—	—	—	—	—	—	—	5	—	
42	14	14	10	10	5	2	0	SW	2.4	7.6	6.9	—	4	17	13	4	
50	21	12	11	7	3	2	0	SW	2.4	7.4	6.6	—	3	17	13	—	
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	
43	20	15	13	9	2	2	0	NE i S	4.1	7.4	6.6	—	3	18	7	—	
—	11	11	10	6	4	2	0	SE i SW	2 6	7.1	—	—	—	—	5	—	
50	17	14	12	10	3	3	0	E	2.6	8.1	6.9	—	2	19	8	—	
48	15	11	8	8	3	2	0	SW	3.6	7.9	7.1	—	1	19	11	10	
—	20	9	7	6	4	1	0	—	—	—	—	—	—	—	5	—	
—	15	12	11	9	2	1	0	SW	3.6	7.0	6.3	—	4	16	11	—	
—	16	12	11	8	4	2	1	E	3.0	7.1	6 6	—	3	16	15	—	
46	11	11	11	8	4	1	0	SW	2.5	7.9	7.2	—	2	22	10	—	
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	
4	14	12	10	8	3	2	1	SW	3.7	7.7	7.4	—	3	18	9	—	
—	18	13	10	8	3	1	0	—	—	—	—	—	—	—	12	—	
—	14	12	9	7	3	1	1	W	2.5	7.8	7.1	—	4	20	11	—	
—	16	14	10	5	2	1	1	SE	3.3	7.1	6.5	—	3	16	9	—	
—	16	11	9	7	4	0	0	E i SE	2.8	7.7	6.9	—	3	18	11	—	
3	11	10	6	4	3	1	0	W	3.0	7.3	5.9	—	3	16	8	—	
—	14	11	11	7	2	0	0	SW	2.7	7.5	6.7	—	2	17	4	—	
—	12	10	9	7	2	1	1	—	—	—	—	—	—	—	8	—	
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	
—	14	10	8	5	2	1	1	S	3.1	7.3	6.5	—	4	18	11	—	
4	16	12	8	6	4	1	0	SW	3.7	7.3	6.9	22	4	17	8	—	
—	20	11	7	6	3	1	1	NE	3.7	7.2	6.5	—	4	15	7	—	

МЕТЭАРАЛАГІЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА
за лістапад 1933 года

Тэмпературныя ўмовы гэтага месяца былі наступныя: з пачатку месяца трымаліся даволі высокія дадатныя т-ры, прыблізна 5—8°, потым паступова знізіліся і 8-га па ўсёй БССР за выключэннем паўднёвай зоны адзначан пераход праз 0° да адмоўных т-р. Далей наглядаўся некаторы ўздым т-ры. 14-га і 15-га ў паўднёвай палове БССР сярэднія сутачныя т-ры павысіліся да 7—8° у той час, як па поўначы зноў панізіліся да —2°. З гэтага чысла т-ра значна зніжаецца, на поўдні да —6, а на поўначы да —13°. Такія значныя марозы трымаліся да 24-га, калі наступіла некаторае пацяпленне і 25-га мясцамі т-ра павысілася да 1—2° вышэй нуля. Але пацяпленне было кароткачасовае і 29-га ўжо наглядаліся т-ры ад —10 да —16°.

У выніку маем, што сярэднія месячныя т-ры на поўначы ніжэй нармальных прыблізна на 2°, пасоўваючыся к поўдню т-ры зраўніваюцца з нармальнымі і на самым поўдні амаль на 1° вышэй нармальных. Наогул-жа сярэднія месячныя т-ры хісталіся ад —2,8 да +1,5°. Максімальныя т-ры дасяглі 8—12° і наглядаліся з пачатку месяца, мінімальныя т-ры асабліва нізкія, да —20°, наглядаліся на паўночным усходзе БССР, на паўднёвым захадзе яны дасяглі толькі —11 —15°.

Ападкаў за месяц выпала 50—70 мм за выключэннем паўднёвай зоны, дзе выпала менш, усяго 30—50 мм. Нармальна-ж для лістапада выпадзенне 40—50 мм, такім чынам па ўсёй БССР за выключэннем паўднёвай зоны выпала некалькі больш нармальнай колькасці ападкаў.

На працягу месяца асабліва вялікія ападкі выпадалі 1-га, мясцамі больш 20 мм, 14-га і 15-га, да 20 мм за выключэннем поўдня. У іншыя дні першай паловы месяца таксама паўсюды вельмі часта былі ападкі, якія давалі да 5 мм. Другая палова месяца была пераважна сухой. Вятры пераважалі паўднёва-заходнія з сярэднімі хуткасцямі каля 3 м/сек.

Воблачнасць складала 70—75% агульнага пакрыцця неба. Колькасць пахмурных дзён вельмі вялікая, да 20 на працягу месяца.

Снегавы насціл к канцу месяца ўтварыўся толькі па паўночным усходзе БССР.

Н. Малішэўская.

Сельска-гаспадарчая гідра-метэаралагічная характарыстыка вегетацыйнага перыяда 1933 года

Звычайна ўмоўна прыймаюць, што фактычная вегетацыя сельска-гаспадарчых культур пачынаецца вясной, калі сярэдняя сутачная тэмпература паветра пераходзіць праз +10° у бок павышэння і канчаецца ўвосень, калі сярэдняя сутачная тэмпература пераходзіць праз +10° у бок паніжэння. [1] Сярэдняя шматгадовая дата гэтага пераходу для БССР укладваецца ў тэрмін

[1] А. І. Кайгарадаў „Кароткі нарыс сельскагаспадарчых кліматычных умоў БССР". БДВ, 1932 г.

паміж 28/IV і 9/V: для паўночнай зоны 7—9/V, для пераходнай 4—5/V, цэнтральнай 1—3/V і паўднёвай 28—30/IV. У гэтым годзе пераход сярэдніх сутачных тэмператур праз $+10^0$ вясной у бок павышэння, г. зн. пачатак фактычнага вегетацыйнага перыяда, адбыўся 10/V у паўночнай зоне і 7/V у астатняй частцы тэрыторыі БССР.

Але прыведзеныя даты трэба лічыць умоўнымі, таму што ў далейшым тэмпература не была ўстойлівай і ў маі і ў першую дэкаду чэрвеня зніжалася да 6^0—7^0, нават да 4^0 (3/VI,— Слуцак, Чэрыкаў, Барба) і толькі пачынаючы з 7/VI па ўсёй тэрыторыі БССР тэмпература трымаецца вышэй 10^0, але ніжэй нормы на 2^0—3^0. Гэту дату—7/VI—фактычна і трэба лічыць пачаткам перыяда фактычнай вегетацыі. Такім чынам, у параўнанні з сярэдняй шматгадовай маем спазненне пачатку вегетацыі амаль на месяц.

Канец фактычнага вегетацыйнага перыяда нармальна ў БССР адбываецца паміж 15—28/IX: у паўночнай зоне 15—19/IX, у пераходнай 20—23/IX, у цэнтральнай 22—27/IX і ў паўднёвай 26—28/IX.

У гэтым годзе канец фактычнага вегетацыйнага перыяда адбыўся 6/IX, але, таксама як і ўвесну, лічыць гэту дату канчатковай нельга, бо на працягу амаль усяго верасня м-ца тэмпература хістаецца каля $+10^0$ і толькі 3/X канчаткова пераходзіць праз $+10^0$ у бок паніжэння.

Табл. № 1

Кліматычная зона	Пачатак		Канец		Працягласць у днях		Скарачэнне ў днях
	1933	сярэд.	1933	сярэд.	1933	сярэд.	
Паўночная . .	7/VI	7-9/V	3/X	15-19/IX	123	130—136	7—13
Пераходная . .	7/VI	4-5/V	"	20-23/IX	"	139—142	16—19
Цэнтральная . .	7/VI	1-3/V	"	22/27 IX	"	145—150	23—27
Паўднёвая . .	7/VI	28-30/IV	"	26-28/IX	"	150—159	27—31

Як відаць з табліцы, не гледзячы на прадленне перыяда ўвосень, у параўнанні з сярэдняй шматгадовай увесь перыяд скарочан: на поўначы на 7—13 дзён, у пераходнай зоне—16—19 дзён, у цэнтральнай—23—27 дзён і на поўдні—27—31 дзень. Такое скарачэнне вегетацыйнага перыяда не магло не адбіцца на развіцці сельска-гаспадарчых культур.

Тэмпературны рэжым на працягу гэтага перыяда трымаўся наступны: у чэрвені м-цы сярэдняя месячная тэмпература была ніжэй нормы на $1,4^0$—$3,2^0$ і была роўна $13,9^0$—да $17,7^0$. З другой дэкады ліпеня тэмпература павышаецца і трымаецца вышэй нормы на $0,0^0$—$1,2^0$. Гэта павышэнне тэмпературы працягваецца да 3-й дэкады жніўня, калі яна зноў паніжаецца. Сярэдняя месячная тэмпература за жнівень ніжэй нормы на $1,3^0$—$2,0^0$ і толькі ў трэцюю дэкаду верасня тэмпература паветра зноў павышаецца да 10^0—13^0, г. зн. вышэй нормы на 2^0—3^0 (за ўвесь-жа верасень м-ц сярэдняя месячная тэмпература ніжэй нормы на

0,1°—1,3°). Гэтае павышэнне працягваецца да 3/X, калі наступае канчатковы пераход сярэдніх сутачных тэмператур праз +10° у бок паніжэння. Сярэдняя шматгадовая тэмпература гэтага перыяда роўна 14,4—15,8° (Новае-Каралёва, Калінкавічы). У гэтым годзе сярэдняя сутачная тэмпература за ўвесь перыяд 13,3°—15,1° (Новае-Каралёва, Калінкавічы), ніжэй нормы на 1,1°—0,7°.

Размеркаванне ападкаў па месяцах і зонах і іх адхіленне ад нормы відаць з табліцы № 2.

Табл. № 2.

Размеркаванне ападкаў (1—фактычнае, 2—норма)

Месяцы / Зоны	Май		Чэрвень		Ліпень		Жнівень		Верасень	
	1	2	1	2	1	2	1	2	1	2
Паўночная	82—133	49—55	54—124	78—81	82—120	71—94	72—166	79—91	51—76	44
Пераходная	51—104	50—60	62—153	68—90	56—112	87—92	81—175	70—93	51—181	47—71
Цэнтральн.	52—115	48—57	89—155	75—80	44—140	83—98	91—152	14—79	61—120	47—54
Паўднёвая	46—110	57—60	104—173	68—78	42—102	87—99	81—119	68—70	01-170	53—59

Параўнанне колькасці выпаўшых ападкаў з нормай паказвае, што колькасць іх у 1,5—3 разы перавышае норму і толькі ў паасобныя дэкады (трэцяя дэкада ліпеня і трэцяя—верасня) ападкаў выпадае нязначная колькасць.

Сонечнае ззянне таксама складае нізкі процант ад магчымага (28% пры магчымым 55%). І толькі ў ліпені м-цы яно роўна 55% ад магчымага, г. зн. было блізкае да нормы.

Такім чынам ход асноўных метэаралагічных элементаў зусім адхіляўся ад нормы і складаў не зусім нармальныя ўмовы для росту і развіцця сельгаскультур. Але, улічваючы спрыяючыя мэт. умовы адказнага ў сельска-гаспадарчых адносінах ліпеня месяца, агульны ход метэлементаў не меў дрэннага ўплыву на колькасць і якасць ураджаю сельска-гаспадарчых культур, за выключэннем некаторых гародніх.

Ход надвор'я ў ліпені м-цы спрыяў таксама пасяванню збожжавых—азімых і яравых. Пасяванню гародніны і корнеклубнеплодаў спрыяў далейшы ход надвор'я, асабліва ў верасні.

Выключэннем з'яўляюцца некаторыя гароднія расліны: гуркі, памідоры і часткова капуста, на якіх надвор'е ўсяго перыяда адбілася зусім дрэнна. У паніжаных месцах рэльефа, у выніку празмернай вільгаці, дрэнна адчувала сябе бульба.

Уборка азімых культур пачалася ў трэцюю дэкаду ліпеня, у якую надвор'е вельмі спрыяла ўборцы.

У трэцюю дэкаду жніўня пачалася сяўба азімых культур, якая працягвалася ўвесь верасень.

У першую палову м-ца надвор'е было мала спрыяючым для разгортвання сельскагаспадарчых прац, але пачынаючы з другой паловы м-ца і асабліва ў трэцюю дэкаду, калі ўстанавілася сухое і цёплае надвор'е, была поўная магчымасць паспяхова скончыць уборку яравых і гародніны і пасеў азімых.

Становішча надвор'я ў першую дэкаду верасня спрыяла з'яўленню ўсходаў азімых па ўсёй тэрыторыі БССР. Поўныя ўсходы з'явіліся ў другую дэкаду верасня.

К канцу разгледжваемага перыяда азімыя—жыта і пшаніца знаходзяцца ў фазе кушчэння, становішча іх здавальняючае.

С. Старобіна.

Вынікі праракання вышыні веснавога паўнаводдзя ў 1933 годзе на рэках БССР [1]

У выніку прапрацоўкі гідролага-мэтэаралагічных дадзеных зімы 1932-1933 году, Гімеінам БССР 7/III быў складзен прагноз вышыні веснавога паўнаводдзя па галоўнейшым рэкам рэспублікі, з якога магчыма было зрабіць вывад, што вышыня паводкі на ўсіх рэках будзе вельмі блізка падыходзіць да нормы.

Гэты прагноз быў распаўсюджан па зацікаўленым арганізацыям БССР, а таксама з мэтай узгаднення дасланы Дзярж. Гідралагічнаму Інстытуту, Цэнтральнаму Бюро Надвор'я СССР і Гімеіну УССР.

Аднак у выніку таго, што па паведамленню ЦБН на тэрыторыі БССР чакалася надзвычайна моцнае развіццё цыкланічнай дзейнасці, намі быў складзен другі варыянт прагноза вышыні паўнаводдзя, які ўлічваў максімальна магчымы ўздым узроўняў вады на рэках пры дадзеных гідрамэтэаралагічных умовах зімы. Для чаго пры карыстанні формулай праф. І. М. Лебедзева для рр. Дняпра, Прыпяці і Пцічы прымаўся бал „цыкланічнасці" вясны, роўны +1 (г. зн. вышэй нормы), а для астатніх рэк, па якім чакаемая вышыня паводкі вызначалася па атрыманым намі раўнанням сувязі паміж метфактарамі і вышынёй паводкі, к вылічанай вышыні дадавалася яго сярэдняя квадратычная памылка.[2] Першы і другі варыянты прагноза 16/III былі паведамлены на паседжанні Штаба па барацьбе з паводкай і лёдаходам пры СНК БССР, і па прапанове апошняга другі варыянт таксама быў дасланы спажыўцам і надрукаваны ў газетах БССР.

10/III намі ад Гімеіна УССР быў атрыман прагноз для некаторых вадпастоў беларускай часткі басейна р. Дняпра, па якому чакалася вельмі высокае паўнаводдзе.

У цяперашні час, калі грэбні паводкі на рэках БССР ужо прайшлі, маецца магчымасць падвесці вынікі ўдачнасці прагноза (гл. табліцу).

Зрабіўшы аналіз гэтай табліцы, атрымоўваем наступныя вывады:

1. Больш здавальняючым з'яўляецца першы варыянт прагноза. Дрэнныя вынікі атрыманы толькі на р. Зах. Дзвіне ў Су-

[1] Артыкул друкуецца з значным спазненнем з прычыны часовага спынення выдання „Дэкаднага бюлетэня" ўлетку гэтага года (Рэд.).

[2] Вызначаная такім шляхам новая вышыня паводкі была супастаўлена з вынікам, атрыманым па формуле Лебедзева.

Рака	Пост	Чакаемая вышыня паўнаводдзя над „0“ граф. па дадзеным			Чакаемыя даты		Фактычныя дадзеныя			Памылкі ў вышыні паводкі					
										1 варыянт ГМІ БССР		2 варыянт ГМІ БССР		ГМІ УССР	
		Гімеіна БССР (першы варыянт)	Гімеіна БССР (другі варыянт)	Гімеіна УССР	Гімеін БССР ускр. ракі і грэбні	Грэбняў паводкі па ГМІ УССР	Вышыня паводкі	Дата ўскрыцця	Дата прахода грэбня	У сантыметрах	У % к амплітудзе макс.	У сантыметрах	У % к амплітудзе	У сантыметрах	У % к ампліт.
Зах. Дзвіна	В. Гараны [1]) .	736	780	—	Ускрыцё ў канцы трэцяй дэкады сакавіка і пачатку красавіка месяца. Грэбні паводкі ў першай і пачатку другой дэкады красавіка	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	Веліж [1]) .	545	580	—		—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	Сураж . . .	745	790	—		—	565	2—IV	25—III	180	30	225	37	—	—
	Віцебск. . .	677	780	—		—	579	31—III	22—III	98	12°	201	+25	—	—
	Ула . . .	665	780	—		—	594	28—III	24—III	71	8′	186	°20	—	—
Дняпро	Орша . . .	633	666	763		12-IV	503	21—III	20—III	130	20°	163	+25	260	40
	Магілеў . .	608	6'5	661		14—IV	621	21—III	23—III	13	4′	4	1—	40	12
	Рагачоў . .	212	220	245		16—IV	205	28—III	27—III	7	4′	15	8—	40	21
	Жлобін . . .	318	327	—		—	311	30—III	28—III	7	2′	16	5—	—	—
	Рэчыца . . .	459	475	536		19—IV	496	30—III	31—III	37	16°	21	9—	40	17
	Лоеў . . .	547	598	617		20—IV	456	30—III	2—IV	91	16°	142	+24	161	28
Бярэзіна	Барысаў . .	336	354	375		13—IV	312	21—III	22—III	24	15°	42	+27	63	41
	Бярэзіна . .	245	276	—		—	267	21—III	22—III	22	9′	9	4—	—	—
	Бабруйск . .	280	320	357		16—IV	293	23—III	26—III	13	5′	27	°11	64	24
	Парычы . .	241	273	—		—	241	27—III	27—III	0	0′	32	°16	—	—
Сож	Прапойск . .	350	400	402		13—IV	322	27—III	21—III	28	9′	78	+24	80	25
	Гомель . . .	450	550	553		17—IV	414	28—III	30—III	36	7′	136	+26	139	27
	Н. Цярэшкавічы . .	600	682	—		—	555	26—III	31—III	45	11°	127	31	—	—
Прыпяць	Дарашэвічы .	301	345	—		—	283	27—III	7—IV	18	8′	62	+26	—	—
	Мазыр . . .	362	427	474		18—IV	260	25—III	11—IV	102	22	167	35	214	45
Пціч	Пціч . . .	498	509	—		—	421	27—III	29—III	77	30	88	34	—	—
Свіслач	Менск . . .	360	450	—		—	393	17—III	19—III	33	9′	57	°15	—	—
	Церабуты . .	530	609	—		—	528	19—III	22—III	2	0′	81	°18	—	—
	Прытыка . .	557	664	—		—	540	20—III	22—III	17	3′	126	+23	—	—

ража і р. Пцічы ў чыгункавай станцыі Пціч, для якіх памылка складае 30% амплітуды максімумаў у той час, калі звычайна за дапушчальную велічыню памылкі прыймаецца толькі 17—20% амплітуды. Добрыя вынікі атрыманы па р. Зах. Дзвіне ў Віцебска і Улы, дзе памылкі не выходзяць за межы 8—12% амплітуды, па р. Бярэзіне з памылкай 0—15%, па р. Сож з памылкай 7—9%, Свіслачы 0—9%, а таксама па р. Дняпро ў Магілёва, Рагачова, Жлобіна і Рэчыцы, для якіх памылкі роўны 2—16% амплітуды. У астатніх пунктах вынікі прагноза магчыма лічыць здавальняючымі.

2. Прагноз па другому варыянту для большасці пунктаў нездавальняючы. Іменна здавальняючыя вынікі атрыманы толькі: па р. Дняпро за выключэннем Оршы, па Бярэзіне за выключэннем Барысава і па р. Свіслачы за выключэннем Прытыкі. У астатніх пастоў памылкі выходзяць за межы дапушчальных і нават у некаторых пунктаў, напрыклад, у Мазыра і Суража, даходзяць да 37% амплітуды максімумаў.

3. Таксама нездавальняючым з'яўляецца прагноз, які быў складзен тэарэтычнай секцыяй гідралогіі Гімеіна УССР, бо велічыня памылак амаль ля ўсіх пунктаў, за выключэннем Магілева і Рэчыцы, выходзіць за межы дапушчальных, дасягаючы ў некаторых пастоў 41—45% амплітуды.

Неабходна ўказаць, што ўмовы фарміравання паўнаводдзя 1933 года на некаторых рэках (Зах. Дзвіна і верхавіны Дняпра) былі вельмі ненармальныя з прычыны таго, што грэбні паводкі праходзілі да пачатку лёдаходу, якія выклікалі штучныя мясцовыя ўздымы ўзроўня, чым у асноўным і тлумачыцца схадзімасць фактычных вышынь з другім варыянтам нашага прагноза і прагноза ГМІ УССР для некаторых пастоў р. Дняпра.

Выходзячы з доўгатэрміновага прагноза надвор'я і маючыхся шматгадовых назіранняў над ускрыццем буйных рэк БССР, чакалася масавае ўскрыцце рэк у канцы трэцяй дэкады сакавіка і пачатку красавіка, а праход грэбняў паводкі—у першай і пачатку другой дэкады красавіка. Гэтыя меркаванні блізка падыходзілі да прагноза дат праходу грэбняў, які быў складзен Гімеінам БССР.

Але дзякуючы значнаму павышэнню тэмпературы, да +12, +15° у перыядзе 13—21 сакавіка, якое ў сваю чаргу выклікала інтэнсіўнае таянне снегавага насціла, масавае ўскрыцце буйных рэк пачалося ў трэцяй дэкадзе сакавіка і нават раней, наступіўшае за гэтым пахаладанне спыніла інтэнсіўнае фармаванне паўнаводдзя на рэках і прывяло к таму, што даты праходу грэбняў паводкі амаль супалі з датамі ўскрыцця рэк. Выключэннем з'яўляецца р. Прыпяць, па якой, не гледзячы на пахаладанне, працягвалася павольнае нарастанне гарызонтаў, што і выклікала на ёй праход грэбня паводкі ў перыяд 7—11 красавіка.

П. Дудкін.

Адказны рэдактар П. Мамаеў, тэх. рэдактар П. Дудкін, члены рэдкалегіі А. Кайгарадаў, П. Бугаеў.

Друкарня БелАН. Заказ № 14. Гарліт № 610. Тыр. 1000 экз. 13 стар.

Москва 35 Ленинский 4.2.34 17

Ленинский 4.2.34 16

Москва

Софийская Набережная

№ 38 Гидрометеорологичес

станция

ЦЮК